Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 СНЕЖНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 245 (28861)

«УЧАСТКОВЫ – АМАЛЬ ШТО ПСІХОЛАГ» ЧЫРВОНКА

НА ТРЫ ДНІ – У АМСТЭРДАМ ЧЫРВОНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:

«Спадзяюся, што ўсе гэтыя пытанні з Масквой па падатковым манеўры ў найбліжэйшы час будуць вырашаны. Наш аптымізм выцякае са справядлівасці аргументаў, якія выпрацаваны Міністэрствам фінансаў Беларусі, яны сапраўды дастаткова пераканаўчыя. Спадзяюся, што мы будзем вельмі аргументаваныя, і сваю пазіцыю зможам данесці».

КОРАТКА

- **Нацбанк прыняў рашэнне захаваць стаўку рэфінансавання на ўзроўні 10 %.**
- У Беларусі 37,6 % уведзенага ў студзені — лістападзе жылля пабудавана для маючых патрэбу.
- **ДАІ УУС Мінаблвыканкама нагадвае кіроўцам квадрацыклаў аб адміністрацыйнай адказнасці за язду па сельгасугоддзям.**
- Дзеці, якія з'явяцца на свет у радзільнях Мінска ў студзені 2019 года, атрымаюць наборы падарункаў.
- **МПЗ пакуль не будзе ініцыяваць узмацненне жорсткасці адказнасці для нелегальных таксістаў.**

- У Брэсце за спробу ўгону васьмі транспартных сродкаў затрымалі навучэнца прафесійнага ліцэя.
- **Браканьера на аленяў са штата Місуры (ЗША) па рашэнні суда прысудзілі да штомесячнага прагляду мультфільма «Бэмбі».**

Білеты для Лесіка

Фота БелТА.

Учора стартаваў афлайн-продаж білетаў праз касы афіцыйнага білетнага аператара Гульняў, кампаніі «Тыкетпро».

Першым пакупнікам паперовых квіткоў стаў талісман II Еўрапейскіх гульняў — лісяня Лесік. Арганізатары адзначаюць, што адным з асноўных кірункаў падрыхтоўкі білетнай праграмы II Еўрапейскіх гульняў стала абарона ад падробак. Акрамя таго, што кожны білет — як электронны, так і паперовы, будзе абаронены ўнікальным штрых-кодам, пры вырабе паперовых версій выкарыстаны дадатковыя элементы абароны: 3D-галаграма, нанясенне спецыяльнага UV-чарніла і іншыя.

Нагадаем, пачынаючы з 1 снежня ўсе ахвотныя могуць набыць білеты на II Еўрапейскія гульні праз сайт www.minsk2019.ticketpro.by, а ў Еўропе — праз афіцыйных рэсэлераў. У Расійскай Федэрацыі білеты таксама ўжо паступілі ў продаж 15 снежня на сайце афіцыйнага білетнага агента www.ponominalu.ru.

Нагадаем, кошт квітка на спартыўныя спаборніцтвы вар'іруецца ад 5 рублёў або 2 еўра (для замежных грамадзян) да 50 рублёў або адпаведна 20 еўра. Кошт квіткоў на цырымонію адкрыцця складае ад 150 да 300 рублёў у залежнасці ад катэгорыі месца. Цэны білетаў на цырымонію закрыцця некалькі нізкейшыя, іх кошт ад 70 да 150 рублёў. Агульная колькасць пасадачных месцаў на трыбунах падчас II Еўрапейскіх гульняў складзе 381 тысячу з магчымасцю павелічэння іх да 535 тысяч у залежнасці ад попыту і папулярнасці віду спорту.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Па сутнасці

УСЕАГУЛЬНАЕ ПАЧЫНАЕЦЦА З МАЛОГА

Размова з дэпутатамі аб заканадаўстве ў сферы правоў чалавека

Мерапрыемства, якое нядаўна прайшло ў Доме прэсы, можна назваць свайго роду выязным пасяджэннем парламенцкай камісіі. Па ініцыятыве Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі і «Звязды» была зладжана сустрэча з нагоды 70-годдзя прыняцця Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, у якой прынялі ўдзел дэпутаты і прадстаўнікі нашай рэдакцыі. Адбылася зацікаўленая змястоўная гутарка, самымі адметнымі момантамі якой спяшаемся падзяліцца з чытачамі.

СТАР. 4

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Пакупнікам на заметку

Грошы за сертыфікаты вяртаць не будуць

Як зменяцца правы спажыўцоў

Змяненні ў закон «Аб абароне правоў спажыўцоў» уступаюць у сілу з 23 снежня. У Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю расказалі, пры якіх умовах можна будзе вяртаць тавары, ці варта разлічваць на рэшту з падарункавых сертыфікатаў і як змагацца з навязлівым сэрвісам.

Шрыфт нармальнага памеру

З улікам прапаноў спажыўцоў, у апісанні тавару будзе ўказвацца інфармацыя аб краіне паходжання (калі яна не супадае з адрасам вытворцы) і класе энергаэфектыўнасці (напрыклад, у маркіроўцы халадзільнікаў, пральных машын). Прадаўцы, якія рэалізуюць тавары дыстанцыйна праз рэкламу ці іншыя крыніцы (у тым ліку праз інтэрнэт), мусяць указваць цану шрыфтам, не меншым па памеры за палову найбольшага шрыфту ў апісанні.

Замацавалі права пакупніка разлічвацца гатоўкай ці ў безнаяўнай форме. Пры гэтым цана ў залежнасці ад формы аплаты не павінна адрозніваццa.

СТАР. 3

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2019 года, — у падарунак 4 календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы

ISSN 1990 - 763X

18245>

9 771990 763008